пэўных агульнавучэбных і спецыяльных уменняў – трансфармацыйная; увесь матэрыял накіраваны на выхаванне творчай ініцыятыўнай асобы, якая правільна ацэньвае факты, – выхаваўчая. Школьныя падручнікі па мове пабудаваны паводле трох асноўных прынцыпаў – індуктыўнага, дэдуктыўнага і індуктыўна-дэдуктыўнага. У падручніку па беларускай мове для 3 класа прадстаўлены разнастайны наглядны матэрыял.

Літаратура:

1. Варэнік, І. С. Актывізацыя пазнавальнай дзейнасці вучняў I ступені агульнай сярэдняй адукацыі пры дапамозе наглядных дапаможнікаў [Электронны рэсурс] / І. С. Варэнік. – Рэжым доступу : https://conf.grsu.by/alternant 2018/. – Дата доступу : 26. 09. 2023.
2. Зельманова, Л. М. Наглядность в преподавании русского языка / Л. М. Зельманова. – М. : Просвещение, 1984. – 159 с.
3. Яленскі, М. Г. Методыка выкладання беларускай мовы: Сучасная лінгвадыдактыка / М. Г. Яленскі. – Мінск, 2006. – 224 с.

## АРГАНІЗАЦЫЯ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ З ВЫКАРЫСТАННЕМ ІКТ

**Скок Т. С.**

Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь
Навуковы кіраўнік – к. філал. н., дацэнт Лапкоўская А. М.

У сучаснай сістэме адукацыі імкліва набірае хуткасць працэс укаранення інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій (ІКТ), забеспячэнне навучальных устаноў камп’ютарнай тэхнікай, развіццё тэлекамунікацый, глабальных і лакальных адукацыйных сетак. Усё гэта звязана з тым, што інфармацыйная пісьменнасць і культура сталі залогам паспяховай прафесійнай дзейнасці чалавека. Інфармацыйныя тэхналогіі становяцца неад’емнай часткай жыцця сучаснага чалавека. Валоданне імі ставіцца ў адзін шэраг з такімі якасцямі, як уменне чытаць і пісаць. Чалавек новага стагоддзя эфектыўна валодае тэхналогіямі і інфармацыяй, мае новы стыль мыслення, прынцыпова інакш падыходзіць да ацэнкі ўзнікаючай праблемы, да арганізацыі сваёй дзейнасці.

Навучыць дзіця працаваць з інфармацыяй на нацыянальнай мове – складаная задача сучаснай школы. Павышэнне якасці адукацыі ў нашы дні немагчыма без прымянення новых інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій. ІКТ пашыраюць магчымасці настаўніка для ўвядзення вучняў у займальны свет, дзе ім трэба будзе самастойна здабываць, аналізаваць і перадаваць іншым інфармацыю.

Таксама асабліва важна, на нашу думку, развіваць інфармацыйна-камунікатыўную кампетэнцыю вучняў у рэчышчы нацыянальнага выхавання. Нацыянальная культура кожнага народа мае велізарны выхаваўчы і



Рэпазіторый ГрГМУ

фарміруючы патэнцыял. Маральнае развіццё адбываецца шляхам прысваення вопыту чалавецтва ў працэсе практычнай дзейнасці і засваення нормаў чалавечых узаемаадносін. Гэтыя нормы з'яўляюцца ўзорамі, дзе сканцэнтраваны маральныя эталоны, прынятыя ў соцыуме.

Увогуле, калі звярнуцца да паняцця «інфармацыйна-камунікацыйная тэхналогія», дык у навукова-метадычнай літаратуры прадстаўлена шмат азначэнняў дадзенай тэхналогіі. Мы будзем прытрымлівацца наступнай трактоўкі: «ІКТ) – гэта сукупнасць метадаў і праграмна-тэхнічных сродкаў, якія выкарыстоўваюцца з мэтай суправаджэння адукацыйнага працэсу, з мэтай ўзмацнення нагляднасці, павышэння пазнавальнай актыўнасці вучняў» [1, с. 12]. Дадзенае паняцце больш дакладна раскрывае сутнасць інфармацыйна-камунікацыйнай тэхналогіі. Настаўнікам могуць быць выкарыстаны розныя ІКТ на любым з этапаў навучальнага працэсу.

У пачатковай школе ўзнікае неабходнасць азнаёміць вучняў з асноўнымі ўласцівасцямі інфармацыі, навучыць іх прыёмам арганізацыі і планавання дзейнасці, у прыватнасці вучэбнай, пры вырашэнні пастаўленых задач; даць першапачатковае ўяўленне аб камп'ютары, сучасным інфармацыйным грамадстве, сучасных інфармацыйных тэхналогіях.

ІКТ таксама актыўна выкарыстоўваюцца для арганізацыі самастойнай работы вучняў. Гэта можна прасачыць таксама і на прыкладзе навучальнага працэсу і ў пачатковай школе, напрыклад, у 4 класе. Разгледзем канкрэтна, як ІКТ дапамагаюць вучням арганізаваць самастойную дзейнасць. Гэта можа праяўляцца праз: самакантроль ведаў; павышаюць аб'ектыўнасць самакантролю ведаў; прадастаўляюць магчымасць выбару сваёй траекторыі навучання і самаправеркі засваення матэрыялу; прадастаўляюць магчымасць сістэматызаваць веды, паўтараць, замацоўваць вывучаны матэрыял, вырашаць інтэрактыўныя практыкаванні, развіваць вобразнае мысленне, памяць; прадастаўляюць магчымасць атрымання дакладнай інфармацыі аб выніках сваёй працы на розных этапах навучання; развіваюць навыкі самастойнай працы, самаацэнкі.

Выкарыстанне розных форм ІКТ спрыяе паглыбленню ведаў навучэнцаў, стварае аптымальныя ўмовы для засваення ведаў у сістэме міжпрадметных сувязей. Работа па гэтых тэхналогіях спрыяе павышэнню пазнавальнай цікавасці да прадметаў; садзейнічае росту паспяховасці навучэнцаў; фарміруе навыкі самастойнай дзейнасці; спрыяе стварэнню сітуацыі поспеху для кожнага вучня [2, с. 67].

ІКТ пры арганізацыі самастойнай работы можна ўжываць з ухілам на развіццё нацыянальнай самасвядомасці вучняў. Для гэтага на ўроках і класных гадзінах можна выкарыстоўваць гульні з нацыянальным кампанентам, віктарыны, займальны матэрыял. Усё гэта будзе спрыяць маральнаму выхаванню малодшага школьніка.

Неабходна адзначыць, ІКТ павінны выконваць пэўную адукацыйную функцыю, дапамагчы дзіцяці разабрацца ў патоку інфармацыі, успрыняць яе, запомніць. ІКТ павінны выступаць як дапаможны элемент навучальнага працэсу, а не асноўны. Улічваючы псіхалагічныя асаблівасці малодшага

Репозиторий ГрГПУ

школьніка, праца з выкарыстаннем ІКТ павінна быць выразна прадуманай і дазаванай. Практыка паказвае, што выкарыстанне ІКТ аптымізуе працэсы разумення і запамінання навучальнага матэрыялу, station уплывае на матывацыю малодшых школьнікаў, што несумненна павышае якасць навучання.

Такім чынам, інфармацыйна-камунікатыўныя тэхналогіі адкрываюць больш шырокія магчымасці для кіравання навучальным працэсам. Выкарыстанне мультымедыя сродкаў дапамагае абудзіць і падтрымліваць пазнавальныя працэсы вучняў, паляпшае нагляднасць вучэбнага матэрыялу, робіць яго даступным, забяспечвае больш дакладную і поўную інфармацыю пра вывучаемы прадмет ці з'яву, інтэнсіфікуе самастойную працу і дазваляе весці яе ў адвольным тэмпе.

Літаратура:

1. Киселев, Г. М. Информационные технологии в педагогическом образовании / Г. М. Киселев, Р. В. Бочкова. – М. : Дашков и К, 2013. – 305 с.
2. Ксенозова, Г. Ю. Перспективные школьные технологии : учеб.-метод. пособие / Г. Ю. Ксенозова. – М., 2000. – 157 с.

# АДМЕТНАСЦЬ АКТАВЫ Ў ПАЭЗІІ НІЛА ГІЛЕВІЧА (НА ПРЫКЛАДЗЕ ВЕРШАЎ «ІСЦІНА, АДВЕЧНАЯ ЯК СВЕТ», «ПАЭТ І ФІЗІК-АТАМНІК У НЕЧЫМ»)

**Урбановіч К. А.**

Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь
Навуковы кіраўнік – Тарасава С. М.

Як падаецца ў адным з апошніх выданняў энцыклапедычнага даведніка В. Рагойшы: *«Актава (ад лац. octava – восьмая) – васьміpадковы верш, радкі якога часцей за ўсё пішуцца пяцістопным або шасцістопным ямбам і рыфмуюцца па схеме АбАбАбвв. У першых шасці радках павінна вытрымлівацца чаргаванне розных па націску рыфмаў (мужчынскіх і жаночых, мужчынскіх і дактылічных і г. д.), завяршаюць жа актаву два радкі, звязаныя сумежнай рыфмоўкай»* [1, с. 339].

Агляд гісторыі названай вершаванай формы ў сусветнай і беларускай паэзіі дазваляе канстатаваць яе прысутнасць у мастацкай творчасці пісьменнікаў розных узростаў, у творцаў, розных па сваіх мастацка-стылёвых адзнаках. Іх вершы ў форме актавы выразна вылучаюцца сярод іншых арыгінальнасцю зместу, яркай метафарычнасцю, багатай інструментоўкай вершаванага радка. Узоры актавы сустракаем у творчасці Янкі Купалы, Максіма Багдановіча.